**Мікалаеў, М.** Застаюцца зарубіны на сэрцы / М. Мікалаеў // Герой працы (Шуміліна). — 2002. — 15 лют. — С. 2.

## ЗАСТАЮЦЦА ЗАРУБІНЫ НА СЭРЦЫ



Час-лекар заглушае боль, але не настолькі, каб не помніць вайну. Афганскую, тую, якую ахрысцілі з часам захопніцкай, акупанцкай. А калі Сяргей Барысаў вяртаўся ўжо з афганскай зямлі, ляцеў у Кушку, сэрца перапаўняла гордасць: усё-такі ваявалі не дарэмна, дапамаглі дэмакратычнай рэспубліцы.

З часам каштоўнасці пераасэнсоўваюцца, асабліва тыя, у якіх была ідэалагічная падаплёка. Тым не менш гэта ніколькі не прымяншае тых нервовых нагрузак, якія давялося перанесці маладому савецкаму салдату. Можа, хто з учарашніх цывільных юнакоў і не хацеў тады акунуцца ў віхуру вайны (а што вайна ў Афганістане ішла – ведаў тады кожны), аднак ніхто не сказаў: «Не магу, не хачу!»

У арміі – загад, калі трэба ваяваць – у юнакоў не пытаюцца. Ды і даведаўся Сяргей Барысаў з вёскі Чысці Сіроцінскага сельсавета (а прызываўся з Віцебска, бо пасля школы вучыўся ў горадзе на электразваршчыка), што будзе служыць у Афгане, толькі калі трапіў у горна-вучэбны цэнтр. Адных адпраўлялі ў Кушку – на самую граніцу Туркменіі з Афганістанам, яго ж разам з іншымі, хто адпраўляўся з Душанбэ, у Епатань. Пасля трохмесячнай вучэбкі быў Кабул і нарэшце – мястэчка Шынданд.

Не дэсантнікам служыў Сяргей Барысаў – мотастралком. Далі яму кулямёт, з якім ён не расставаўся праз усю службу, і суправаджаў калоны машын, аберагаў ад знянацкіх нападаў душманаў. Былі баі, было і страшна. Мясцовасць для беларуса нязвыклая – спякота, пяскі і ў дабавак пастаяннае пачуццё, што ты на вайне. Але не змаладушнічаў наш зямляк, годна ваяваў на чужыне. Апошні месяц да «дэмбеля», калі войскі з Афганістана былі выведзены, Сяргей даслужваў у Кушцы. Гэта ўжо была родная зямля, дзе не страляюць, дзе можна было і паспаць без той пастаяннай трывогі, якую несла з сабою вайна.

На той час на грудзях у Сяргея Леанідавіча Барысава красаваўся медаль «За баявыя заслугі». Уручылі ўзнагароду яму ў сярэдзіне службы, уручылі на вачах аднапалчан.

Сёння ўсё гэта ў мінулым. Толькі ці ўсё? Застаюцца, як гэтага ні хочаш, зарубіны на сэрцы, застаецца парушанай нервовая сістэма, застаюцца ўспаміны, ад якіх нікуды не дзенешся. Застаюцца і сябры-таварышы, з якімі дзялілі хлеб-соль у далёкім Афгане. Але ніколі, як невыносна ад вайны ні было, не гублялі савецкія салдаты чалавечай годнасці. Гнеў, калі і перапаўняў сэрца, то не перарастаў у нейкую раз'ятранасць, жорсткасць ды садызм. Душманы – іншае, яны маглі пайсці на ўсякі жахлівы крок, які цяжка было зразумець савецкаму салдату.

С. Л. Барысаў мае сваю сям'ю. Жонка, Людміла, нарадзіла двое дзяцей. Жывуць у вёсцы Слабада ў трохпакаёвай кватэры. Трымаюць гаспадарку, нядаўна купілі каня. Патрэба ў ім вялікая: і сабе трэба пераараць агарод, і дапамагчы сваёй маці, якая адна жыве ў вёсцы Чысці.

Сёння былы афганец працуе ў камунгасе зваршчыкам. Працай задаволены, як задаволены і жыццём. А пры ўсякай нагодзе, калі згадваюцца афганскія падзеі, ён у думках перакідваецца да тых 80-ых, якія прынеслі для юнака першыя, па-сапраўднаму цяжкія выпрабаванні.

**М. Мікалаеў**